# АСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСАЎ ЗАМЕЖЖА Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ

**Слямнёў М.А., Важгурава А.У.,**
*ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Тэма «беларусы замежжа» – аб’ект даследавання прапанаванага паведамлення – прадстаўляе цікавасць як у навуковым, так і практычна-прыкладным, прагматычным плане. Навукоўцаў у першую чаргу цікавіць, якія якасныя змены адбываюцца ў нацыянальна-культурным жыцці нашых суайчыннікаў, асабліва ў кантэксце глабалізацыі сучаснага грамадства. Практыкаў (палітыкаў, эканамістаў, прадпрымальнікаў і г.д.) – магчымасці выкарыстання беларускай дыяспары для развіцця міжнароднага супрацоўніцтва, павышэння іміджа Беларусі ў краінах яе існавання і інш.

Спачатку адзначым, што па прыблізных падліках у цяперашні час у далёкім і блізкім замежжы жыве каля 3 млн, як іх часам абцякальна называюць, «выхадцаў з Беларусі», якія з’яўляюцца, умоўна кажучы, альбо нашымі «братамі па крыві (этнічныя беларусы), альбо «па глебе» (яны самі або іх продкі ў свой час «укараніліся» ў беларускую зямлю, далучыліся да традыцый і звычаяў народа, мовы і культуры, а затым з’ехалі ў іншыя краіны).

Прычыны перасялення як першай, так і другой катэгорый асоб у чужыя краі – тэма спецыяльнага разгляду. Але калі здзейсніць кароткі экскурс у параўнальна недалёкае гістарычнае мінулае, то гэта, перш за ўсё, наступствы эканамічнага і ваенна-палітычнага крызісу Расіі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя, Сталыпінскія рэформы, Першая Сусветная вайна, Кастрычніцкая рэвалюцыя і наступная за ёй грамадзянская вайна, рэпрэсіі 30-х гадоў, Вялікая Айчынная вайна, будоўлі сацыялізму і камунізму, пасля завяршэння якіх многія працавітыя беларусы заставаліся на асвоеных тэрыторыях і, нарэшце, распад СССР. Асаблівую групу «замежных беларусаў» утвараюць т.зв. «аўтахтоны», карэнная нацыянальная меншасць, прадстаўнікі якой ніколі не пакідалі арэал свайго пражывання, а проста перасоўваліся дзяржаўныя межы паміж краінамі-суседзямі (беларусы Беласточчыны ў Польшчы, Віленскага краю – у Літве, памежных раёнаў Пскоўскай, Смаленскай і Бранскай абласцей – у Расіі і Віцебскай і Магілёўскай – у Беларусі).

Статыстыка рассялення беларусаў замежжа ў розных рэгіёнах свету даволі прыблізная. Па некаторых звестках, у Расіі сёння пражываюць каля 800 тысяч беларусаў, Украіне – 270 тысяч, Казахстане – 100 тысяч, Літве – 55 тысяч, Польшчы – 50 тысяч, Эстоніі – 20 тысяч. Што тычыцца вельмі далёкіх ад нас геаграфічных месцаў – ЗША, Канады, Лацінскай Амерыкі,



Рэпазіторый ВГУ

Аўстраліі і інш., то колькасныя паказчыкі тут вельмі разыходзяцца і нярэдка бяруцца, як кажуць, «са столі».

Нацыянальна-культурны лёс беларускіх мігрантаў, як зрэшты, і аўтахтонаў, складваўся па-рознаму. Значная іх частка з часам паглыналася новым асяроддзем сацыяльнага пражывання і ў выніку цалкам губляла этнічныя і культурныя прыкметы свайго народа. Некаторыя захоўвалі іх на сямейным узроўні. У месцах жа кампактнага пражывання ствараліся рознага роду беларускія арганізацыі: зямляцтва, клубы, нацыянальна-культурныя таварыствы, цэнтры, аб'яднанні і нават рэгіянальныя аўтаноміі. Да прыкладу, у Расіі сёння маецца каля 90 беларускіх арганізацый, у Польшчы – больш за 20 і т.д. Менавіта яны складаюць этнічны і нацыянальна-культурны субстрат дыяспары, якая з'яўляецца інстытуцыйным фарміраваннем, адметнай супольнасцю з выразным уяўленнем аб агульнай радзіме і выбудоўваемых на гэтай аснове калектыўнай сувязі і групавой салідарнасці.

Многія з азначаных таварыстаў абмяжоўваюць сваю дзейнасць толькі захаваннем і прапагандай нацыянальна-культурных традыцый, старажытных беларускіх абрадаў, фальклорнай спадчыны. Гэта таксама добра, але, безумоўна, недастаткова. Галоўная задача – узбраенне новага пакалення беларусаў замежжа роднай мовай – азначальнай рысай любой нацыі. Пазітыўны вопыт у гэтай справе назапашаны беларускімі дыяспарамі Польшчы, Літвы, Малдовы і інш. Але гэта не правіла, а хутчэй выключэнне з яго. Стан ведання роднай мовы маладымі беларусамі замежжа, у тым ліку і ў Расіі, вельмі нізкі. На вялікі жаль, і сама Беларусь ня можа пакуль ганарыцца ўзроўнем нацыянальна-моўнай адметнасці сваёй моладзі. Абмеркаванне гэтага далікатнага пытання не ўваходзіць у нашы задачы.

Для нармальнага функцыянавання і развіцця дыяспары ў прававым полі краіны пражывання вельмі неабходна нацыянальна-культурная падтрымка метраполіі. Маладая беларуская дзяржава адразу ж пасля здабыцця незалежнасці пачала яе аказваць і на заканадаўча-прававым, і на практычна-арганізацыйным узроўні. Гэтая праца настойліва праводзілася і ў наступныя гады. Да прыкладу, можна адзначыць маштабныя дзяржаўныя праграмы «Беларусы ў свеце» (2011–2015 гг.), «Культура Беларусі» (2011–2015 гг.), «Развіццё канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой» (2011–2015 гг.) і інш.

Варта, аднак, прызнаць, што, нягледзячы на значныя поспехі па ўсталяванні сувязяў з замежнымі суайчыннікамі дзяржаўная дыяспаральная палітыка Беларусі ў сваім канцэптуальна абгрунтаваным і заканадаўча аформленым выглядзе была прадстаўлена толькі ў 2014 годзе ў Законе РБ «Аб беларусах замежжа» [1]. Гэта рамачны, праграмны дакумент, шэраг яго палажэнняў з'яўляецца «семантычна размытым» і

Рэпазіторый ВДУ

патрабуе спецыяльнага тлумачэння. У той жа час у ім выразна пазначаны прынцыпы, мэты і асноўныя накірункі дзяржаўнай палітыкі ў галіне адносін з беларусамі замежжа, распрацаваны адпаведныя нормам міжнароднага права магчымыя формы і метады іх падтрымкі, вызначаны паўнамоцтвы Прэзідэнта, урада, міністэрстваў замежных спраў, культуры, адукацыі, Упаўнаважанага па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа і іншых дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый.

Асаблівая ўвага звернута на тое, што дзяржаўная палітыка ў галіне адносін з беларусамі замежжа павінна быць накіравана на захаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці нашых суайчыннікаў, аказанне садзейнічання ў рэалізацыі іх нацыянальна-культурных і іншых правоў з улікам міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства краін пражывання, забеспячэнне салідарнасці беларусаў ва ўсім свеце, максімальнае выкарыстанне магчымасцей дыяспары для развіцця беларускай дзяржавы і прасоўвання яе пазітыўнага іміджу, стварэнне спрыяльных умоў для жадаючых вярнуцца на гістарычную радзіму.

Прынцыпова важна, што ў законе даецца аперацыянальнае, і, увогуле, прыдатнае для практычнага прымянення вызначэнне паняцця «беларусы замежжа» [Артыкул 1, Артыкул 4]. Беларусамі замежжа лічацца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за яе межамі; замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пражываюць у іншых дзяржавах пры ўмове, што яны самі або іх продкі па прамой ўзыходзячай лініі нарадзіліся або пражывалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі; і, нарэшце, любыя замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пражываюць у іншых дзяржавах і ідэнтыфікуюць сябе як беларусы па этнічных і сацыякультурных прыкметах. Этнічны прынцып тут не з'яўляецца самадаўлеючым. Але пры гэтым асэнсаваная самаідэнтыфікацыя, як акцэнтуецца ў законе, павінна быць абавязкова падмацавана грамадскай або прафесійнай дзейнасцю па захаванні беларускай мовы, развіцці беларускай культуры за мяжой, умацаваннем дружалюбных адносін дзяржаў грамадзянскай прыналежнасці або пастаяннага месца жыхарства беларусаў замежжа з Рэспублікай Беларусь і іншымі пацверджаннямі добраахвотнага выбару на карысць умацавання духоўнай і культурнай сувязі з народам Беларусі і яго дзяржавай [Артыкул 4].

Прыняцце Закона РБ «Аб беларусах замежжа» дазваляе не толькі сістэматызаваць працу дзяржаўных і недзяржаўных структур па ўдасканаленні сувязяў з «замежным сегментам» беларускага народа, але і арганічна ўпісаць яе ў строгі кантэкст міжнароднай дзейнасці дзяржавы.

Напрыканцы адзначым, што беларуская дыяспара як блізкага, так і далёкага замежжа неаднастайная па сваіх ідэйна-палітычных і ідэалагічных



Репозиторий ВГУ

поглядах. Маецца нямала арганізацый, якія вельмі крытычна адносяцца да ўнутранай і знешняй палітыкі РБ (гэта, у прыватнасці, яскрава паказалі падзеі, звязаныя з выбарамі Прэзідэнта РБ у жніўні 2020 года).

Пры правядзенні дзяржаўнай дыяспаральнай палітыкі з такім фактам неабходна лічыцца і ставіцца да яго з разуменнем. Развітая дыяспара заўсёды спрошчана рэпрэзентуе шырокі спектр палітычных і ідэалагічных поглядаў свайго народа. Самім жа канфліктуючым беларускім арганізацыям за мяжой варта шукаць аб'яднальныя каштоўнасці. Галоўная сярод іх – захаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, асабліва роднай мовы, пошук шляхоў процідзеяння працэсам асіміляцыі ў краінах пражывання з улікам татальнай глабалізацыі сучаснага грамадства. У адваротным выпадку беларуская дыяспара як унікальны этнічны і сацыякультурны феномен праз некалькі пакаленняў можа знікнуць у большасці краін свету.

*Літаратура*

1. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб беларусах замежжа» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://belros.org /doc/zakon_belorus_zarubeg_2014.pdf. – Дата доступу: 18.09.2020.

Репозиторий ВГУ